БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.
Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Надпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб
на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 24. Менск. Субота 20 красавіка 1918 г. Год I

Менск 20/IV.

Адным з законау натуры есьць, што усякая масса, займаючая аграніччаны кавалак мейсца у паветры тым болей спраціуляецца сьціскаючай яе сіле, чым мацней робіцца сіла і чым меньшым робіцца аб'ем у які уціскаецца масса. Ад гэтага фізыко-мэханічнаго закону пявольна і чалавечая псыхіка —злашча псыхіка супольства.

Псыхіка супольства у даунейшай расійскай імпэрыі знайходзілася пад безсыстэмным, але зауседным моцным гнетам гістарычна-маскоускаго самауластва. «Самодзержавіе» пільна сачыло, каб з пад тлоку яго распасьцертаго на усе грамадзкае жыцце гнету ні вырвалася ні адна вольная думка. У скутку гэтаго было, што ні толькі шырокія народныя массы у імпэрыі, але і інтэлігэнцыя былі зауседы гатовы да ні відзенаго у сьвеці выбуху рэволюцыі, сягаючаго тым далей у сваіх мэтах, чым мацнейшым быу сьціск. Гэтым тлумачыцца той спэцыфічна-расійскі максімалізм, каторы, затрыманы збройнай сілаю у 1905—1906 г.г., праявіуся у 1917 г. у—ва усей сіле свасй дзержаунай піразважнасьці.

Натуральна, што ад максімалізму ні былі пазбаулены народ і інтэлігэнцыя уцісканых Вялікаросіяй нацыяу. Але максімалізм адчуваўся тут больш у сфэры палітычнай чым соцыяльнай. Расьлі сэпаратыстычныя пачуцця, Узмацоувалася бажане найхутчэй пазбавіцца ад вяліка-дзержаунаго,—роуна «брацкаго» для далекіх поуночных якутоу і для поудневых украінцау, гнету і тагды будаваць сваю хату. Рэвалюцыя узмацавала гэты нацыянальны максімалізм, бо аказалася, што вялікарускі народ хоча у гэтым пытанні захаваць гістарычныя традыцыі цароу.

Беларуская народная інтэлігэнцыя, так сама пашла па гэтай дарозе і пачала гарачкова тварыць новыя формы дзержаунаго быту. Тым часам трэба было інчэ зьбіраць народныя сілы. Праца на два бакі моцна аслабляла сілы інтэлігэнцыі і у канцы ні дала усе ж тых скуткау, якіх ад-яе чакалі.

Але усе-ж яна прынесла Беларусі зьліты, злучаны у нацыянальным пачуцці народ і гатовую дзержаунную форму. Зрабіць з гэтых дзьвух сілау аднолітную беларускую дзержаву, злучыць іх з у с і х бакоу,—вось што павінна быць нашым бліжэйшым заданнем.

Для такой працы трэба ні архітэктау, бо плян ужо скончаны, а скромных муляроу, мазольная праца каторых цяпер тым важней, чым болей адчуваецца яе патрэба.

Архітэкт беларускай дзержаунасьці—інтэлігэнцыя, павінна цяпер узяцца за мулярства—і памяць яе за гэта блаславіцца у патомках.

Эканамічны стан Гэрманіі.

Павэдлуг Эміля Цыммэрмана, «Vossische Zeitunb» № 175.

	міліонаў марак.
бавэлны на » »	620,—
чэсанай воўны »	61,4
нічэсанай » » »	412.—
лёну і пакулі » »	74,3
пянькі і пласконья	44,5
сырога едвабу » »	158—
джуту » » »	94—
рожных іншых валокнаў » »	21.—

А ўсяго з заграніцы увозілося матэр'ялу для тэкстыльных выробау на $1^1/_2$ міліарда марак, фабрык для гэтаго было 813.000, у каторых працавало 2,4 міліонаў чалавек.

І малое дзіця, піша Цымэрман, зразумее, што за час вайны гэтыя фабрыкі блізка саўсім павінны былі стаць. І што быў нідахватак вопратак і бялізны—гэта ведалі і ворагі немцаў (апрача можэ Расійцаў).

Ворагі немцаў хацелі б нямецкую тэкстыльную прамысловаць задушыць назаўсёды, каб немцы куплялі у іх гатовыя бялізну і адзежу.

Дальш—нехват тлустасьцяў, як масло, алей, сала і інш.—прымусіў пакінуць работу 150.000 працоўнікаў. А іщчэ большая шкода ў тым, што без гэтых рачэй гаспадарка можэ прыйсьці ў запінад: масло, сало, алей—патрэбны для працаўнікоў, а рэшткі ад алею—макухі вельмі карысны для скаціны. Без гэтых прадуктаў ні чалавек, ні скаціна ні могуць добра працаваць.

У 1913 гаду Гэрманія увозіла да сябе 534,375 тоннаў т. е. больш трох міліонаў пудоў масла (Oelkuchen) і 100 міліонаў багатых алеям зернятаў. З гэтых зернятаў выраблялося 48 міл. пудоў алею і 52 міл пудоў макухаў, вельмі добраго корму для жывёлы і ад каторых застаецца надта моцны гной.

Гэтых, так патрэбных для Нямеччыны, зернятаў у 1916 г. ні хватала ад 30% да 90%.

Апрача таго найбольш немцам патрэбна медзь, бо сваёй медзі у 1913 г. яны мелі каля 2,7 міл. пудоў, а з заграніцы, найбольш з Амэрыкі, прывозілі 13,5 міл. пудоў. Медзь вельмі патрэбна дзеля электрычнай прамысловасьці.

Скур і аўчын увозілося ў Гэрманію на 400 міл. марак, бо $^2/_3$ часьці іх прыходзілося браць з заграніцы. Спадзевацца. што лік скур і аўчын у Гэрманіі павялічыцца—нельга, бо ніхват корму, асабліва макухаў, паменшае лік жывёлы.

Рыжў увозілося 18 міл. пудоў; каўчуку—1 міл. пуд. на 105 міл. марок.

Калёніяльная палітыка, павэдлуг аўтара, залежыць ад пытання, чы могуць немцы мець калёніі, каторыя могуць даць даволі тлустасьцяў і валокнаў.

—

Што было зразумелым і вядомым нямецкаму дзіцяці і ні было таёмным для французаў і англійцаў, тое ніведалі, а іншыя, быць можа, умелі ніведаць—у Рассі, бо тут больш займаліся голымі лёзунгамі, чым статыстычнымі фактамі.

Цяпер мы больш—менш ведаем, чаго ніхват у Гэрманіі і на што найбольшае там будзе запатрэбаванне, а значыцца і высокія цэны. І вось дзеля гэтаго павінны мы у сваёй будучай гаспадарцы зьвярнуць як найбольшую увагу на тое, што тым, чы іншым спосабам можна калі ні узбагаціць зразу, то хоць падмацаваць абяднелы і зруйнованы вайной наш край.

А. Данілевіч.

АБВЕСТКІ:

Аддзел Прасьветы Гарадзкой Управы заклікае асобы,—працаваушыя у рожных кірунках дзіцячаго зашкольнаго навучання, ведаючыя гульні, гімнастыку, ручныя работы і інш., знаючыя мейсцовыя мовы, на кіраунікау дзяціных пляцау, якія маюць быць у Менску.

Просяць заходзіць ад 12—2 гадз. у памешканне аддзелу на Юрэускай вул., № 2 (уход з дзядзінцу).

Заведуючая аддзелам прасьветы
М. Фрумкіна

Агульныя весткі.

«Daily News» піша: Ад канца мінулага тыдня палажэнне ураду сталося цяжкае. Міністры, палежачыя да работнікай партыі вядуць нарады над тым, чы выпадае ім дальш падтрымоўваць урад.

Кажуць, што першая стаіць проціў ваеннай павіннасьці у Ірляндзіі, калі аднычасна ні будзе уведзяны Homerule і што Варнес саусім ні згаджаецца с палітыкай ураду у справі ваеннай павіннасьці у Ірландзіі. Быць можэ, што тры злучанныя работніцкія, выканаўчыя камісыі адзавуць з ураду міністраў з работніцкай партыі.

БЭРЛІН 16/IV. «Voss Ztg». даведаўся што урад фінляндскі мае у скорасьці пераехаць з Вазы, дзе тымчасова памясьціўся, да Гэльсінгфорсу. Да гэтаго ўжо ўсё прырыхтована, толькі дарогі у сталіцу ні саўсім іщчэ ачышчаны ад чырвонагвардзейцаў.

Разам з урадам пераежджаюць у Гэльсінгфорс і пасольства—якіх пакуль што толькі два. Сойм. будзе склікапы за раз жа, як толькі урад вернецца у сталіцу. С прычыны прыходу нямецкаго войска ў ўсей Фінляндзіі радасьць і ажыўленне.

БЭРЛІН 15/IV. Прычын адстаўкі японскаго міністра заграпічных спраў—Мотоно—называюць дьзве. Адны кажуць, што ён меў занадта ўжо вялікія пляны на Сыбір і гэта згубіло яго, бо японскі урад задаволіцца і меншымі ваенными крокамі. Другія кажуць,—і гэтаму больш даюць веры у Бэрліне, што Мотоно праз лад зважаў на Амэрыку і гэтым пашкодзіў справе японскай. Павэдлуг гэтаго выход Мотоно ні зьменіць становішча Японіі у справе Сыбіру.

БАЗЭЛЛЬ 15/IV. «Daily Mail» піша: з доляй Ам'ену звязана доля Лёндыну. Баранінь Ам'ен—значыцца бараніць Лёндон. Страта Ам'ену значыло б страціць французам помач англійцаў.

Весткі з Расіі.

Усё менне т-ва мануфактуры «Ивана Коновалова съ Сыномъ» аб'яўлена Выжшай Радаю Народнай Гаспадаркі ўласнасьцю Расійскай савецкай рэспублікі. Аб'яўленне Рады уступае у сілу ад 15 лютаго 1918 году. Усім работнікам і служачым фірмы прыказана аставацца на мейсцох пад страхам аддачы пад рэвалюцыйны суд. «Центротекстиль» павінен з'арганізаваць новае урадовае праўленне.

Савецкай уладаю у Маскве выданы дэкрэт аб ассігноўцэ абаротных сумаў для забэзпечэння тэкстільнай прамысловасьці бавольнаю. Увесь крэдыт на гэта выносіць 502.424.500 р. і будзе выдавацца часьцямі па месяцам.

У Маскве выходзіць тыднё-

РАСПАРАДЖЭННЕ.

аб сэквэстру і купоўлі харчовых прадуктаў Упраўленнем места Менску.

§ 1.

Ад 22 красавіка 1918 года гарацкім Управленнем будуць сэквэстрованы гэткія прадукты:

Збожо (жыто, пшано, ячмень, грэчка, мешанае збожо і маіс). **Мука** (усякіх гатункау і мешаная). **Крупы, каша і грачуха. Выробы з мукі** (упакованыя і без упакоукі). **Хлеб, булкі,** песта с пшэннай мукі, апрача цесткау, тортау і кандзітарскіх выробау. **Стручковыя.** (Фасоля, гарох, чачавіца, просо, рыж, саго). **Картофля, буракі і іншыя корнеплоды. Варыво сушонае і квашанае** (выключаючы агуркі). **Цукер** (галовачны, кавалкавы, пясок, цукровы сіроп). **Соль** (кухонная і для быдла).

Подлуг сэквэстрацыі ніхто ні мае права купоулі і продажы памянёных харчовых прадуктау, Гэта датычэ экспэдытарскіх і камісьонных складоу і заложаных таварау. Хлеб у колькасьці 2 расійскіх фунтау на аднаго чаловека дозваляецца прадаваць і далей (гл. § 3). Забарона прадажы ні датыча меськіх крамоу, хаурусных складау а також бежанскіх і доброчынных камітэтау.

§ 2.

Ні падлегаюць сэквэстру:

Колькосьць прадуктау азначаных пры каждым нумэру назначаецца для аднэй сям'і.

1) **Мука** усякіх гатункау і мешаная	до 20 руск.	фун.
2) **Крупы**, каша, грачуха, проса	» 5 »	»
3) Выробы з мукі (упаков. і без упак.)	» 2 »	»
4) Стручковыя (фасоля, гарох, чачавіца, рыж, сага)	» 2 »	«
5) Цукер (галовачны, кавалк. пяс. цукер. сыроп)	» 5 »	»
6) Варыво:		
а) сушонае	» 2 »	»
в) квашаное	» 20 »	»
с) консэрвованае у банках	» 5 штук.	

§ 3.

Лішкі прадуктау, перевышаючыя паказаную норму павінны быць сданымі для вольнай прадажы у сьледуючые мейсцы:

Паліцэйская I часьць: ад 23 да 27 красавіка.
а) склад № 7, Петрапаулауская.
в) меськую краму № 4. Захарэуская 46.

Паліцэйская II часьць ад 24 да 28 красавіка.
а) склад № 4, Юрэуская № 15.
в) меськую краму № 3. Рог Петрапаулаускай і Хрышчэнскай.

Паліцэйская III часьць ад 25 да 29 красавіка.
а) харчовы аддзел Менскай Управы Захароуская 97.
в) краму Леукова. Захароуская.

Паліцэйская IV часьць ад 26 да 30 красавіка.
а) склад №3. Серпухоуская 5.
в) склад № 1. Захароуская 47.

Паліцэйская V часьць ад 27 красавікада 1 маю.
а) склад № 13
в) склад № 14 } Нова-Маскоуская 36.

Ні падлегаюць здачы але павінны быць заяулены харчовай Камісіі такія прадукты: Хлеб, картофля, буракі і іншыя корнеплоды і збожо у колькасьці да 20 фунтау.

§ 4.

Звальняюцца ад абавязковай аддачы усякіх харчовых прадуктау: Меская Рада, Меськія крамы, Хаурысы (коопэратывы), хаурысныя ж. д. крамы, больніцы, прытулкі, ахраны, народныя кухні, бежэнскія камітэты, школы, даброчынныя установы.

§ 5.

Усе найменованыя у § 4 інстытуцыі, выключаючы жал. дар. хаурусу, павінны да дня 26 красавіка прэдставіць у магістрат сьпіскі праудзівай колькасьці і гатунковасьці харчовых прадуктау.

§ 6.

Усякіх катэгорыяу устэрыі, гасьпіціцы, гарбатні, рэстарацыі, прыватныя сталовыя і падобныя другія заклады павінны 26 і 27 красавіка здаць свае харчовыя запасы у склад Захароуская 47. Уласьнікау гэтых закладау ні датычэ распараджэнне аб здачы прадуктау па паліцейскім часьцям.

§ 7.

Учасе ад 22 красавіка да 1 мая усякія харчовыя прадукты (гл. § 2) прывезеныя у горад купцамі і прыватнымі асобамі павінны быць прэдстаулены для пакупкі у бліжэйшы меські харчовы склад. На гэтыя прадукты цэны установлены будуць асобна, а ні тыя, што у § 10. Купоуля гэтых прадуктау у Менску забаранонена.

§ 8.

Пасьля 1 мая 1918 году прадукты найменованыя у § 1 (за выключэннем запасоу пазвол. у § 2) павінны належаць да места Менску. **Памешкання і крамы будуць кантраліравацца.**

§ 9.

Устэрыям, цукерням і г. іншым (гл. § 6) будзе накінута колькасьць сэквэстрованых прадуктоу, прыбліжачы, патрэбная на адзін тыдзень Апрача гэтаго уласьнікі могуць меці для спажытку свае сям'і колькасьць прадуктау паказаную у § 2.

§ 10.

Пры вольнай прадажы устанауляюцца гэткія цэны:

На збожо: жыто, пшаніца, ячмень, мешаное збожо, маіс,	па 60 кап.	за 1	фунт.
» муку рожных гатункау і мешаную	» 60 »	» »	»
» кашу, грачуху	» 75 »	» »	»
» мучныя выробы (упакованыя і бэз упакоукі	» 120 »	» »	»
» стручковыя: фасоля, гарох, чэчэвіца, просо, рыж, саго	» 75 »	» »	»
Варыво:			
а) сушонае	« 50 »	» »	»
в) квашонае	« 30 »	» »	»
с) консэрвавая. у банках	« 100 брутто.		
Цукер	« 120	за 1	фунт.

§ 11.

З дня апублікования гэтаго респараджэння усякі вываз найменаваных прадуктау з м. Менску забараняецца.

§ 12.

Купоуля гэтых прадуктау у далейшым часе пазваляецца толькі на картачкі (Бежэнскія камітэты могуць выдаваць своім членам прадукты і без карточок).

§ 13.

Ніспоуненне карацімуцца штрафам да 20.000 марак,—апрача грашовай кары можа быць наложана кара пазбауленнем свабоды да 5 гадоу.

§ 14.

Каждая сем'я, павінна да 20 красавіка забэзпечыць сябе з харчоваго Комітэту, Юрэуская 3, харчовымі картачкамі.

Менск 17 красавіка 1918 году.

Камэндант
фон-ФРАНКЕНБЕРГ.
Палкоунік.

вік «Накануне» каля якога группуюцца пісьменнікі усякіх напрамкаў расійскай інтэлігэнцыі: «Настаў час, калі павінны быць да караню перагледжаны каноны традыцыйнай веры рускай інтэлігэнцыі,—такая мэта новай часопісі.

Рада Народнаго Суда у Петроградзе, просіць Раду Петроградзкай камунны, пазволіць назначаць высылку для асобаў каторыя будуць прызнаны вартымі гэтаго.

——

Сэнатор Белецкій; быўшы ваенны міністр Сухамлінаў працуюць ў друкарні пры астрозе «Кресты» як каррэктары і зарабляюць за гэта 3-4 р. на дзень.

——

«Л-ндэрыяда».

У № 68 «Извѣстій» надрукавана: «З'езд радаў Заходней обласьці».

Смаленск. 10 красавіка у Смаленску аткрываецца з'езд радаў Магілёўскай, Віцебскай і Смаленскай губ. арганізаваны абластною радай эвакуіраваўшай з Мінску. Наперад пастаноўлено было склікаць з'езд толькі ад двух губэрняў апрача Смаленскай, але дзеля бажання нікаторых радаў гэтай губэрні яна была прылучана. Аднак пытанне аб тэррыторыі заходняй обласьці выменіцца на самом з'ездзі. Можна с пэўнасьцю сказаць, што прэдстаўнікі ад Віленскай і Менскай губ. астануцца тые-ж самые дзеля таго, што «Совѣты» у гэтых мейсцох разбурэны.

На з'езд ускладаюцца вялікія задачы: паміж іншым з'езд павінен выясьніць тактыту што датыча адносін даакупаванаго краю. Як ведама, тамака беларусная Рада намагаецца стварыць нацыянальную буржуазную дзержаву пад апекаю Нямеччыны. Гэта надта ніспакоіць тутэйшыя «савецкія» колы. Пастаноўлена актыўна спрацiўляцца беларускай буржуазіі. З'езд скажа сваё паважнае слово у гэтым пытанні. (Б. П.)

Цікава, ці з'езд пашлець сюды сваіх «таварышаў-эмісараў», ці не?

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

У Міліцыі уводзяцца што раз новыя і новыя парадкі. Замест увольняных са службы даунейшых служачых, цяпер іх мейсцы займаюцца часьць немцамі, а часьць быушымі ішчэ служачымі у паліцыі.

18 красавіка а 5-ай гадзіне вечара нямецкі ваенны паліцмэйстар заклікау да сябе з усіх каміса, ыятау служачых, каторым было заяуляно а пераходзе міліцыі пад нямецкі загад і дадзены былі асобыя распараджэння.

Гэтымі днямі мае пайсьці у атстауку і камісар III часьці—Гутман.

——

У Губэрнскім Прысутстві зацьверджаны нямецкім градоначальствам новыя пэнсыі: членам прысутства замест даунейшых 450—125 рублеу; дзелавод замест 250—65 р. і канцэлярыст замест 130 р.—30 рублеу у месяц.

——

Сталовая пачтова-тэлеграфных служачых дзеля нехвату прадуктау і грошэй—зачыняецца. Гэта ішчэ адна шышка і то вельмі балючая—с паміж іншых, якія сыплюцца за апошнія часы на нашых пачтова-тэлеграфных чыноунікау.

——

Новыя бокавыя кніжкі з 19-го красавіка праз дамавыя камітэты выдавацца ні будуць, а кажнае сямейство павінно браць само для сябе.

Выдача солі, цукру і сернікау часова стрымана.

Пасьля 22-га крас. выпечка хлеба для прыватнай прадажы забаронена. Запас хлеба больш 20 ф. павінен быць заяуляны у гарацкую управу. Пакуль ні выйдзе запас апошняй выпячкі дазваляецца праз некалькі дзен прадажа хлеба ні больш 2-х ф. на душу. Пасьля хлеб будзе прадавацца у 70-ці крамах і 30 каапэратывах толькі па картачках.

——

У IV прыходскім вучылішчы (Канюшэнная вул) завяліся новыя парадкі: вучэнікам прыходзіцца чысьціць свой двор і іншыя «мейсцы», праз што нікаторыя вучні на час сваей чаргі чысьціць--ні паказываюцца у школу.

Гэто ужо саусім ні па таварыску: трэба або усім адмовіцца ад гэтай прыкрай работы, або—калі іншаго выхаду німа—ні выкручывацца ад свайго дэжурства, памятаючы, што ніякая брудная работа ні можа запэцкаць чыстага чалавека.

——

Гарадзкі санітарны камітэт павэдлуграспараджэння нямецкай улады да панядзелку—22 красавіка павінен здаць усе гаспадарство камітэту і шпіталь для прастытутак, каторыя пераносяцца у другое мейсца.

Цяперашні штат з доктарам Зуменам і праз доугія гады служачай фэльчаркай Сіціцынай на чале—расфарміроуваецца.

——

Вучыцялі Пінскаго павету гласныя, прыехаушыя на губэрнскаеа земскае сабранне жалуюцц на свае цяжкія цяперашнія варункі жыцця.

За люты і сакавік вучыцялі пінскаго пав. атрымалі пэнсыі па 47 рубл. на месац. Двое с паміж памерло проста такі з голаду.

На 28 красавіка пінскія вучыцялі склікаюць свой з'езд, на каторым маюць параіцца аб сваім цяжкім палажэнні. Поруч з гэтым мае быць выясьнена справа і аб прылучэнні пінскаго павету да Украіны

Паведамляюць пінскія вучыцялі ішчэ і аб тым, што большэвікі, уцікаючы, захапілі с казначэйства мяст. Століна (адміністр. цэнтр. пінск. пав.) больш 700000 рубл,

Ну, гэта ні навіна.

——

Спорка паміж губ. Казначэйсвам і Акружным судом, каторы атпратэставау спісак пэнсыяу служачых у казначэйстве па большэвіцкай таксе перадаецца гэрманскай уладай на разгляд выжэйшай краевай улады.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоунаго камандавання за 19 красавіка 1918 року.

З А Х А Д: На Фландрскай раўніне адбываліся нівялікія спатычкі разведчыкаў з ангельскімі і бэльгійскімі старажав. ахранамі. Моцныя атакі робленыя непрыяцелям с поўначы і поўн.-захаду на Вютсхэт намі адбіты. Непрыяцель ішчэ пры сваіх прыгатаваннях панеў цяжкія страты ад нашаго зніштчаючаго агню. Паміж Байэль і Ла-Бассэ моцныя артылерыйскія баі. Поўн.-заходней Бэтэна наша пяхота зрабіла напад на ліні непрыяцеля паўночней канала Ла-Бассэ і захапіла нескольки гарматаў. Каля Фэстюбер і Жываншы бітвы с пераменным шчасьцем. Мы узялі болей 600 палонных. Пасьля ўзмацаваўшагося у апошнія дні артылерыйскаго абстрэлу каля Аўры, учора былі моцныя французскія атакі на Нарысель і Морэйль. Непрыяцель густымі калонамі некольки разоў пераходзіў у атаку на абодвых бакох Аўры праз Сенекскі лес і па абодвых бакох дарогі Эйі-Морэйль, але быў адкінуты намі з вялікімі для яго стратамі. У часе гэтых баёў моцны гарматні агонь трываў і ноччу.

У С Х О Д. **Украіна**: у Таўрыі мы занялі Чаплінку і Мялітопаль.

Македонскі фронт: нашыя штурмовыя аддзелы узялі у палон каля Чэрны некольки італьянцаў і сербаў.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

Ад афіцэрскаго бюро нямецкая улада запатрэбавала прэдставіць спіскі тутэйшых пэнсыанэрау і належнай ім за два месяцы выплаце.

——

У дэмакратычнай сталоуцы на ст. Менск для служачых і рабочых Л.-Р. ж. д. цяпер бяруць за дзве стравы бяз хлеба па 1 р. 25 к.; але за апошнія часы пачалі даваць абеды настолькі кепскія, што служачыя маняцца падаць аб гэтым заяву у харчовую часьць пры упрауленні, зьвертаючы увагу на сталовую пры Губэрнскім Земстві, дзе за два рублі даюць добрыя абеды с хлебам.

——

Паміж жалезнадарожнікау распаусюжываецца вазваніе віленскаго гэрманскаго жалезнадарожнаго упрау лення аб тым, каб усе агенты, астаючыся на сваіх мейсцах, спакойна адбывалі і дальш сваю службу, ні баючыся прапажы пэнсыі і вычатау з запрацованых уложэных грошэй у упрауленскую ашчадную касу.

Але усе гэта адносіцца толькі да служачых на самой дарозі, а ні да служачых у упрауленні гэтай дарогі, каторым, як на тое ліха, так сама што дня хочыцца есьці.

——

Курсы беларусазнаўства.

Субота 20 красавіка.

Т. Грыб. *Нашые песьняры. I. Янка Купала.*

У нядзелю 21 красавіка **лекцыі ні будзе.**

Пачатак лекцыі у **7** гадз. веч.

Лекцыі чытаюцца у памешканні Беларускае Рады (Захароуская, 43).

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтво **Т-во «Заранка».**